# З Новым годам, сябры!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
31
снежня
чацвер
№ 37(1558)

## Тэлетайп

«Учора · Сёння · Заўтра»

### ПРЫМІЦЕ САРДЭЧНЫЯ ВІНШАВАННІ

*з Новым годам, пажаданні добрага здароўя, поспехаў і шчасця!*

**М. АБАДЗІНЬСКІ,**
*Генеральны консул ПНР.*

### З НОВЫМ ГОДАМ

віншую прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнтаў, аспірантаў, рабочых і служачых універсітэта. Жадаю добрага здароўя, шчасця, творчых поспехаў у рабоце і вучобе!

**М. МЯШКОЎ,**
Міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

### НЯХАЙ

Новы год будзе для Вашага калектыву годам далейшых працоўных перамог у выкананні рашэнняў XXVII з'езда партыі на карысць нашай Радзімы!

**КАЛЕКТЫЎ ВА «ІНТЭГРАЛ».**

### НАПЯРЭДАДНІ

*Новага года, калі падводзяцца вынікі пройдзенага, і ў думках усе мы ўжо звяртаемся да заўтрашніх спраў і клопатаў, жадаем Вам, паважаны Леанід Іванавіч, і калектыву, якім Вы кіруеце, моцнага здароўя, асабістага шчасця, актыўнай і плённай работы, вялікіх творчых і працоўных поспехаў на карысць нашай Радзімы!*

КАЛЕКТЫЎ
*Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР.*

### ШЧЫРА

*віншуем Вас з Новым годам! Прыміце нашы пажаданні моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця і новых творчых поспехаў на карысць нашага народа.*

**КАЛЕКТЫЎ**
Беларускага НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі.

## Лепшы падарунак

ХУТКА Крамлёўскія куранты абвесцяць аб заканчэнні старога і пачатку новага года. Засталіся апошнія гадзіны. Напружаныя, мітуслівыя. Як хутка яны праляцяць! І пра год тысяча дзевяцьсот восемдзесят сёмы скажам: мінулы. А пакуль ёсць час спыніцца, азірнуцца, падвесці вынікі сваёй працы.

Сёння можна сказаць, што сёлетні год для мяне і для калектыву кафедры навуковага камунізму быў плённым. Для гэтага ёсць падставы: выйшла ў свет наша манаграфія «Классовая борьба на Западе и ее фальсификаторы» (Выдавецтва «Універсітэцкае», 1987). Яна з'явілася рэзультатам пяцігадовай работы супрацоўнікаў кафедры — аўтараў кнігі.

Класавай барацьбе на Захадзе прысвечана нямала даследаванняў. Артыкулы па данай праблеме публікуюцца ў цэнтральным перыядычным друку — газетах і часопісах. Але гэтага недастаткова. Штуршком для напісання кнігі з'явілася жаданне дапамагчы студэнцкай моладзі глыбей разабрацца ў тых працэсах, якія характарызуюць сучасны капіталізм. У ёй шырока выкарыстаны матэрыялы КПСС, камуністычных партый капіталістычных краін, а таксама работы буржуазных вучоных і інш.

У нашым выданні шмат карыснага знойдуць тыя, хто вывучае праблемы рэвалюцыйнага руху ў краінах капіталу, каго цікавіць становішча рабочага класа, інтэлігенцыі ў сучасным буржуазным грамадстве. Спатрэбіцца яно і студэнтам, асабліва пры падрыхтоўцы да семінараў па навуковаму камунізму, гісторыі партыі, пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

Дарэчы, інфармацыя для тых, каго, магчыма, зацікавіць кніга: яе можна набыць у кіёску галоўнага корпуса.

**Г. ПАШКОЎСКІ,**
дацэнт кафедры навуковага камунізму, кіраўнік аўтарскага калектыву.

*КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ*

## Ці патрэбен савет воінаў запасу?

ТАК, ВЕЛЬМІ. Таму на сумесным пасяджэнні бюро камітэта камсамола універсітэта з былымі воінамі-інтэрнацыяналістамі вырашалася іменна гэта пытанне. Вельмі многа праблем назапасілася ў нас за апошні час у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Знізіўся маральна-палітычны і фізічны ўзровень прызыўнікоў, для многіх пачэсны абавязак абараняць сваю Радзіму ператварыўся ў цяжкі абавязак. Не выпадкова, напэўна, дзеясловы «прызываць» і «праводзіць» уступілі свае месца непрывабнаму «забіраць».

Можа работа камсамольскай арганізацыі БДУ у гэтых адносінах у цэлым і лепш пастаўлена, чым дзе-небудзь, але ўсё-такі яна яшчэ вельмі далёкая ад ідэалу. Па многіх напрамках ВПР нашаму камсамолу патрэбна дапамога: і ў прыцягненні прызыўнікоў у секцыі ваенна-прыкладных відаў спорту, і ў шэфскай рабоце ў школах і ПТВ, і ва ўмацаванні сувязей з воінскімі часцямі і многае іншае. І камсамол мае права разлічваць на дапамогу з боку савета воінаў запасу. Хто, як не хлопцы, якія прайшлі суровую школу армейскага жыцця, ставяць слова «абавязак» вышэй за ўсё? Хто, як не рабяты, якія валодаюць багатым армейскім і жыццёвым вопытам, змогуць перадаваць яго прызыўнай моладзі?

Але на бюро, дзе прысутнічалі прадстаўнікі рэктарата, парткома, камітэта ДТСААФ, райкома камсамола, ставіліся і іншыя пытанні, звязаныя з вучобай ва універсітэце воінаў-інтэрнацыяналістаў. Так, напрыклад, былі выказаны крытычныя заўвагі ў адрас кіраўніцтва кафедры, якая павінна займацца ўдасканаленнем вучэбнага працэсу ў адносінах студэнтаў, што праходзілі службу ў ДРА, але робіць гэта не на належным узроўні. А іх жа баявы вопыт можна і трэба выкарыстоўваць! І ўжо зусім дзіўнай аказалася пазіцыя дэканата юрыдычнага факультэта, які не выканаў інструкцыю МінВНУ СССР аб вылучэнні стыпендый воінам-інтэрнацыяналістам, якія атрымалі ў сесію здавальняючыя адзнакі. Таму савет воінаў запасу патрэбны яшчэ і для таго, каб ставіць розныя пытанні перад савецкімі, партыйнымі, дзяржаўнымі органамі, ваенкаматамі па рашэнню сацыяльна-бытавых умоў жыцця студэнтаў — воінаў запасу.

У рабоце савета будзе шмат праблем. Але чым больш рабят стануць актыўнымі яго ўдзельнікамі, чым больш праявяць энергіі і энтузіязму, тым хутчэй і лепш мы зможам вырашыць іх.

**Ю. БАЦЯН,**
студэнт юрыдычнага факультэта, былы воін-інтэрнацыяналіст.

## І песні, і казкі, і жарты

Пад Новы год на філалагічны факультэт завітаў фальклорны калектыў з Пінскага раёна.

Сёння студэнты БДУ жадаюць больш ведаць пра гісторыю свайго народа, сваёй рэспублікі. Таму падарункі, якія прывёз для студэнтаў фальклорны калектыў, выклікалі вялікую цікавасць.

А прывёз калектыў калядныя песні, жарты, гумар, прысвечаны гэтаму незвычайнаму святу. У прадстаўленні ўдзельнічалі хор, пераапранутыя каза, чорт, мядзведзь, ліса — персанажы з беларускіх народных казак.

Усім гледачам канцэрт фалькларыстаў прынёс шмат задавальнення.

**В. НАВУМЕНКА,**
студэнт філалагічнага факультэта.

Фота АЎТАРА.








## Экспрэс – інфармацыя

СПІС жадаючых будаваць МЖК з моманту пачатку спаборніцтва паміж прадпрыемствамі-дольшчыкамі СТАНОВІЦЦА ЮРЫДЫЧНЫМ ДАКУМЕНТАМ, на аснове якога будуць размяркоўвацца гарантаваны і прэміяльны фонды кватэр. У сувязі з гэтым просім усіх, падаўшых заявы, да 7 студзеня 1988 года пацвердзіць сваё жаданне ўдзельнічаць у сацспаборніцтве. Звяртацца ў 306-ы пакой галоўнага корпуса.

**Ю. ПАЗНЯК,**
старшыня аргкамітэта МЖК.

# 1988

## ШЧАСЦЯ, ЗДАРОЎЯ, ПОСПЕХАЎ ВАМ!
















ГОД прыйдзе. Год пройдзе. Мы сталеем. Са шчырай успешкай углядаемся ў свет. Упэўнены: дабрыня людская не можа ў сэрцы не адгукнуцца. Памятаем: нам быць творцамі ў свеце гэтым. Шчаслівым. Прыгожым. Радасным.

Прыступка, яшчэ прыступка... Год 1988 прыйшоў да зямлян. Вы падрыхтаваліся да сустрэчы? ВІНШУЕМ ВАС!

РЭДКАЛЕГІЯ ГАЗЕТЫ «БУ».

| | ЯНВАРЬ | ФЕВРАЛЬ | МАРТ | АПРЕЛЬ | МАЙ | ИЮНЬ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 |
| ВТ | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 |
| СР | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 |
| ЧТ | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 |
| ПТ | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 |
| СБ | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 |
| ВС | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 |

| | ИЮЛЬ | АВГУСТ | СЕНТЯБРЬ | ОКТЯБРЬ | НОЯБРЬ | ДЕКАБРЬ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 |
| ВТ | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 |
| СР | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 |
| ЧТ | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 |
| ПТ | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 |
| СБ | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 31 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 |
| ВС | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 |


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
31 снежня 1987 г.
Зак. 1601.



220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.